Цана асобнага нумару 20 гр.

Pierasyłka apłačana gotoŭkaj

№ 7 Вільня, Нядзеля 21 Лютага 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цяжкое палажэньне нашай вёскі.

Прыглядаючыся ўважна да сучаснага палажэньня і жыцьця нашай вёскі, кожны бесстаронны чалавек, нават паляк, даходзіць да таго вываду, што гэтае палажэньне сапраўды труднае, амаль не катастрафальнае, як у галіне жыцьця матэр'яльнага, так і маральнага.

Катастрофа набліжаецца перадусім у матэр'яльнай галіне жыцьця, проста кажучы **нашай вёсцы гразіць голад**. Прошлы год увесь наш край пацярпеў вялікі неўраджай: жыта было нагэтулькі слабое, што мясцамі яго ледзь хапіла на сяўбу; авёс і ячмень, каторыя былі шмат лепшыя за жыта, згінулі пад восеньнімі даждждамі, асталася бульба, але і тая мясцамі ўжо кончыцца. Нават моцныя гаспадары, якія прошлымі гадамі мелі на прадажу не адзін дзесятак пудоў збожжа, цяпер асталіся бяз хлеба і ядуць толькі бульбу. З усіх бакоў да нас даходзяць весткі, што на вясну ў некаторых вёсках будзе голад, так як гэта было ў 1919—20 гадох, калі людзі мерлі з голаду. А найгорш тое, што няма ніякіх заработкаў, а як няма дзе зарабіць, то няма за што купіць і людзі часам кідаюць усё, асабліва над граніцаю і ідуць, куды вочы глядзяць, рызыкуючы часам сваей галавою.

Апроч гэтага вялікім цяжарам і крыўдай для нашай вёскі ёсьць **таннасьць вясковых прадуктаў**. То ж дайшло да таго, што найлепшую карову можна купіць за 50—60 злотых, таксама і каня. Бывалі выпадкі, што сяляне прадавалі карову або каня па 20 зл., а на Палесьсі старыя кові нават па 3 зл.! Сьвініны, за кілё жывой вагі, 40 грошаў, авец у Навагрудку нават ня хочуць купляць, бо пры гарадзкой фармалістыцы і аплаце ўсіх падаткаў і належнасьцяў, у горадзе іх рэзаць не аплачваецца!

Гэтак выглядае справа з таннасьцяй вясковых прадуктаў Дык цяпер паўстае пытаньне: **а скуль аплаціць падаткі**, якія ня толькі не паменшалі, але яшчэ пабольшалі, бо прыбылі складкі на безработных і інш? Рэч ясная, што іх аплаціць няма адкуль і затым па некаторых бяднейшых вёсках бадай кожны другі гаспадар апісаны і калі яшчэ ня меў ліцытацыі, то яе спадзяецца.

Ня маючы выхаду, наш селянін пачаў насіць лыкавыя (не скураныя) лапці, чаго ад многіх гадоў не рабіў, перастаў асьвячаць сваю хату газай, а ўвёў даўнейшую лучыву, перастаў нават купляць фабрычныя тавары, а пачаў адзявацца ў саматканыя сьвіткі... Але і гэта мала памагае, бо ў хату заглядае, як мы ўжо казалі, голад. Гаспадары часам кідаюць гаспадарку і ўцякаюць ў горад (або заграніцу), кажучы: „гаспадар Ты Божа, бо чалавек ужо ня можа"; але і ў горадзе не знаходзяць для сябе шчасьця, тагды кідаюцца на ўсё, не зварочваючы ўвагі на ніякія наглыя суды і шыбяніцы... Над граніцай, асабліва пасярод праваслаўнага насельніцтва, можна пачуць нават тугу за колектывамі, „там — кажуць — у колектыве хоць заціркі дадуць, а тут з сваей працы і гаспадаркі я ня маю ніякай карысьці" (аўтэнтычна!).

Вось да чаго дайшла наша вёска! Найлепшая камуністычная арганізацыя не патрапіла б зрабіць таго, што зрабіла руіна гаспадарчага і грамадзкага жыцьця!

Але гэта яшчэ ня ўсё. На вёсцы апроч матэр'яльнай руіны цяпер можна заўважыць поўнае **маральнае зьдзічэньне і ўпадак усялякай рэлігіі**. Маральнае зьдзічэньне выяўляецца ў вялікай колькасьці ўсякіх злачынаў, не выключаючы і забойстваў, а рэлігійны ўпадак — у пустых цэрквах і касьцёлах. Павага духавенства, як праваслаўнага, так і каталіцкага роўна нулю; як адно, так і другое для беларускага народу зусім чужое, дбаючае перадусім аб сабе і аб сваіх матэр'яльных справах, бяз вышэйшых ідэйных асноў у сваей працы. А калі гэтае духавенства і мае якую ідэю і стараецца яе праводзіць у жыцьцё, то гэта ідэя для народу чужая і народ, пазнаўшы падход да свае душы, адварачваецца і ад духавенства і ад ягонай „ідэі." Прыглядаючыся да жыцьця, часам можна заўважыць гэткую праяву, што праваслаўнае духавенства, як прадстаўнік пакрыўджанай рэлігіі, мае больш уплыву на народ, як духавенства каталіцкае, якое прадстаўляе пануючае веравызнаньне. Мясцамі йнаў і праваслаўнае духавенства ня мае ніякай апоры ў народзе і дзяржыцца толькі дзякуючы сяньняшняму палітычнаму і грамадзкаму строю ў Польшчы, а духавенства каталіцкае,—яшчэ сілай даўнейшага мучавіцтва, мае сякую-такую павагу ў народзе. Але як аднаму так і другому народ ня верыць, і так ня верыць, што даволі духоўнаму пры выбарах сказаць: „галасуйце на той і той нумар" — каб той нумар у вачах сваіх парафіян пахаваць да грунту! Гэта сьведчыць, што духавенства з народам ня вяжуць ніякія ніці дружбы і даверу, што яны для сябе чужыя...

Гэтак прадстаўляецца жыцьцё на нашай вёсцы як з боку матэр'яльнага, так і з боку рэлігійна-грамадзкага. Разважыўшы яго ўсестаронна, мы прыходзім да таго вываду, што гэтае жыцьцё ня толькі труднае — яно проста жудаснае. Народ наш, астаўлены бяз ніякай апекі, бяз ніякай помачы, ня відзячы навокал сябе і над сабою нікога свайго, а толькі чужых, пачынаючы ад сэквэстратара, а кончачы на духоўным, кідаецца на ўсе бакі — і няма нічога дзіўнага, што хватаецца за камунізм, як тонучы за саломінку, або за сэктанства...

Пры гэтакіх варунках адзіным выхадам з такога труднага палажэньня было-б:

1) дзяржаўная **беззваротная** помач тым мясцом, дзе ўжо наступіў, або гразіць голад,

2) радыкальнае зьменшаньне сялянам падаткавага цяжару і разам з гэтым скасаваньне ўсіх дзяржаўных і самаўрадавых расходаў, якія дзяржаве не пад сілу (расходы на ўваружэньне, вялікія дыспозыцыйныя фонды, пэнсыі ўрадаўцам і г. п.),

3) скасаваньне усіх падаткавых недабораў з сялян,

4) даць магчымасьць беларускай інтэлігенцыі праз бел. школы, касьцельна-царкоўнае жыцьцё і культурна-прасьветную працу на вёсцы супрацоўнічаць з сваім народам у справе яго матэр'яльнага і маральнага адраджэньня.

Без спаўненьня гэтых варункаў мы ня бачым выхаду з сяньняшняга труднага палажэньня. Споўніць іх ужо наступіў апошні час!

Навагрудзкая беларуская гімназія у небясьпецы.

Бацькаўскі Камітэт, Пэдагогічны пэрсонал і сама вучнёўская моладзь Навагрудзкай беларускай гімназіі, як ведама, саматугам паставілі новы, вялікі (трыпаверхавы), мураваны будынак, які мусяў быць прызначаны на бурсу для гімназістаў, або і на самую беларускую гімназію. Гэты будынак асталося толькі пакрыць (латы ўжо паложаны) і дакончыць працу ў сярэдзіне яго. З галеўшая ад крызысу вёска не змагла аднак гэтае працы ў час давясьці да канца, а прызнаная польскім Соймам дапамога на гэту мэту, ня была дагэтуль выплачана.

Гаспадары будынку апынуліся ў нязвычайна цяжкім, проста трагічным палажэньні, з чаго ўзноў мяйсцовыя палякі, падтрымоўваныя — паміма крызысу — урадавымі кругамі, пастанавілі скарыстаць: яны „запрапанавалі" — „тымчасам" — беларусам, што возьмуць будынак у „арэнду," дакончаць яго і памесьцяць у ім Польскую пачатковую школу. Беларусам-жа гэты будынак мае быць вернены посьле таго, як кошты, выналажаныя на ягонае даканчэньне, будуць выкарыстаны як арэндная плата за карыстаньне будынкам.

З беларускага пункту гледжаньня гэта „прапазыцыя" роўназначна з замахам на самае існаваньне Навагрудзкай беларускай гімназіі, бо 1. нямаведама гдзе канчаецца „прапазыцыя" і пачынаецца рашучы наступ, а 2. пазбаўленьне Навагр. бел. гімназіі сяголетня свайго будынку, ёсьць раўназначным з безгалосым ліквідаваньнем самае гімназіі. — Супроць усяго гэтага, ня толькі беларус, але і кожны чэсны чалавек мусіць рашуча **запратэставаць**.

Не бяз цікавасьці і значэньня тут ёсьць факт, што нават Соймам вызначаныя грошы на даканчэньне Навагр. беларускай гімназіі Урад дагэтуль не дае, адгаварываючыся крызысам, хоць на выканчэньне таго-ж будынку, але ў руках польскіх, дык грошы ёсьць. — І проста на злосную ўжо іронію выглядае факт, што ўсё гэта робіцца іменна з Навагрудзкай гімназіяй, якая пару месяцаў таму назад зложыла такое прызнаньне ў лёйяльнасьці да польскасьці: чаго ад гэтай гімназіі хочуць яшчэ больш?

З беларускага жыцьця.

Ажыўленьне. Значны прырост беларускае інтэлігенцыі ў Вільні выліўся апошнім часам у ажыўленую, публічную і прыватную, лекцыйную акцыю. Шкода толькі, што і з гэтага вышла „паўтара людзкога," бо час лекцыяў ладжаных рознымі інстытуцыямі, колідуе між сабою.

У наступную нядзелю 21 г. м. у 16 гадзіне (роўна!) у памешканьні Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры кс. В. Гадлеўскі заканчывае цыкль сваіх лекцый на тэму „Аб беларускай культуры."

— У гэты-ж дзень у 18 гадз. ў VII залі У.С.Б. студ. т-ва Беларусаведы ладзіць лекцыю грам. М. Пяцюкевіча на тэму „Беларускія друкі ў Віл. бібліатэках."

— У тую-ж нядзелю 21 г. м. у залі Віл. бел. гімназіі, студ. Хв. Ільляшэвіч, а гадз. 18-ай, чытацімё лекцыю аб творчасьці Ядвігіна Ш.

— Падчас такога лекцыйнага люксусу (надбытку) ў Вільні, вёска беларускае інтэлігенцыі так як і ня бачыць: ці-ж сапраўды беларуская інтэлігенцыя ўжо баіцца трудоў і нявыгадаў вёскі?..,

З Віл. Аддзелу Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры. Агульны сход сяброў Аддзелу вызначаны на дзень 27 г. м. у 15 гадз. На

парадку дня: справаздача аб чыннасьці за мінулы год, перавыбары і бягучыя справы. У разе нястачы кворума, сход у гадзіну пасьля 15-ай (знача а гадз. 16-ай) будзе важным пры кожным ліку прысутных.

Беларускі мяшаны хор пад кіраўніцтвам гр. Шырмы адбывае сьпеўкі кожныя: аўторкі, серады і пятніцы а гадз. 20-й (роўна) у памешканьні Бел. Студ. Саюзу (Вострабрамская 9).

Новы гурток Б. І. Г. і К. Апошнімі часамі заснаваўся ў в. Белая, Бельскага пав. гурток Б. І. Г. і К. Урад гуртка: старшыня Б. Панько, скарбнік М. Дацкевіч, сэкрэтар Я. Панько.

Бібліатэка-чытальня ім. кс. В. Гадлеўскага. Гурток Б.І.Г. і К. у в. Расла, Вялейскага пав. адчыніў бібліатэку-чытальню пад назовам Бібл.-чыт. ім. кс. В. Гадлеўскага.

Трэба ведаць, што кс. В. Гадлеўскі, будучы пробашчам у слаўных беларускіх Жодзішках, няхала палажыў працы і вад беларусамі в. Расла, дык як бачым людзі аб гэтым помняць і не забываюць. Слава Вам расьлянцы, што не забываеце і аб сваіх працаўнікох.

З **„Цэнтрасаюзу" ўцякаюць.** Пазнаўшыся на штучках А. Луцкевіча і інш. „патронаў" і тварцоў „Цэнтрасаюзу", адзін за другім уцякаюць стуль ягоныя сябры, нават закладчыкі. Гэтак, Бацькаўскі Камітэт і Пэдагогічная Рада Навагрудзкай беларускай гімназіі, на агульным сходзе 15 г. м., пастанавілі пакінуць „Цэнтрасаюз", гдзе лічыліся сябрамі ад самага ягонага заснаваньня.—Мусіць і сапраўды ў гэтым „Цэнтрасаюзе" далёка горш прадстаўляюцца справы, чымся час ад часу даведываецца аб гэтым беларускае грамадзянства.

А „Цэнтрасаюз", быццам нічога ня сталася, усё сьніць аб „злучэньні", як старэючая дзева аб замужжстве: „Куда вы удалілісь!"...

Канцэрт хору Навагрудзкай бел. гімназіі пад кіраўніцтвам гр. Валынчыка адбыўся дня 15 г. м. ў залі Навагрудзкага меского тэатру. Канцэрт прайшоў удачна.

З БЕЛАРУСІ ПАД САВЕТАМІ.

БССР адстае. Маскоўская „Праўда" піша, што Беларусь у збожжазагатоўках належыць да самых адсталых раёнаў, тымболей, што на Сав. Беларусь вызначана ўсяго каля 11 мілёнаў пудоў збожжа. Гэтае збожжа аднак не забясьпечвае снабжэньня Беларусі хлебам, яго трэба прывозіць з-за межаў БССР.

„Трацкісцкі кантрабандыст Валасэвіч у ролі гісторыка" — пад гэтакім загал. „Зьвязда" (20.XII. 31) перадрукоўвае з „Праўды" стацьцю нейкага Шмідта, у якой крытыкуецца выданы Валасэвічам „Курс гісторыі УсеКП(б)" і яго-ж „Самая кароткая гісторыя УсеКП(б)". У сваіх кніжках Валасэвіч выясьняе, што бальшавізм стаў сусьветным зьявішчам толькі з мамэнту вайны, а да вайны бальшавізм быў толькі расейскай партыяй, якая не вяла змаганьня з міжнародным апартунізмам. „Зьвязда" называе гэта „ганебным скажэньнем гісторыі камуністычнае партыі і паўтарэньнем старога трацкісцкага наклэпу".

Процiў гісторыі Валасэвіча выступіў аж сам Сталін, які гамяоьціў стацьцю ў „Пролетарскай рэволюцыі," у якой даказвае, што бальшавізм выступіў на сусьветную арэну як у часе вялікай вайны, але значна раней; што не сялянства рабіла камуністычную рэвалюцыю, а работнікі.

Цікава яшчэ і тое, што ў сваіх кніжках Валасэвіч удзяліў многа месца Леніну і Троцкаму, як павадыром камунізму, а памінуў заслугі Сталіна. Але найцікавей тое, што кніжкі Валасэвіча вышлі ўжо аж у дзесятым выданьні і дагэтуль сталінцы не агледзіліся, што там была „ерась." „Кароткая гісторыя Усе КП(б.)" вышла і пабеларуску, за гэта „Зьвязда" вініць паліт. рэдактара бел. выдавецтва нейкага Будзіна і заклікае прыцягнуць яго да адказнасьці.

Наагул, цяпер па ўсім СССР ізноў разгарэлася барацьба паміж трацкістамі і сталіністамі. „Зьвязда" (№ 333, 1931 г.) заклікае да змаганьня з трацкізмам і з правымі ўхіламі.

„Мы павінны зараз яшчэ больш узброіць марксыцка-ленінскай тэорыяй для барацьбы супроць усіх антыпартыйных вылазак. Трэба даць рашучы адпор контррэвалюцыйнаму трацкізму. Разам з гэтым мы ні ў якой ступені не павінны аслабляць барацьбы супроць правай небясьпекі, якая застаецца галоўнай на даным этапе"...

З гэтага відаць, што Сталін нейкі камуністычны цэнтр, які рашуча змагаецца як з „левым" трацкізмам, так і з „правымі" ўхіламі ўнутры камуністычнай партыі..

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

Мы ўжо пісалі (гл. № 2 „Бел. Крыніцы" с. г.) аб тым, што новы ўрад у Латвіі Скуенека пачынае душыць нац. меншасьці, у тым ліку і беларусаў. І так былі пакасаваны нац. школьныя інсьпэктараты, паміж іншымі і беларускі, адняты субсыды беларускаму тэатру, скасаваны бел. вучыцельскія курсы і г. д. Апошнім часам рыская газэта „Сегодня" падае, што Скуенек загадаў распрацаваць праект „языковых уставаў" (відаць польскія яму сьніцца(!), паводле якіх толькі ў тых паветах будзе прымацца ў дзяржаўных установах мова нацыянальнай меншасьці, у якіх даная нац. меншасьць становіць прынамся 20 проц. усяго насельніцтва. Далей Скуенек заявіў супрацоўніку „Сегодня," што у Латгаліі ёсьць людзі, якія ня знаюць сваей нацыянальнасьці і што з гэтых людзей робяць расейцаў, беларусаў і г. д. (аб палякох ужо нічога ня ўспомніў), а ён Скуенек, **з гэтых людзей хоча зрабіць латышоў.**

Пры гэтым Скуенек заявіў, што ўзорам для новага праекту аб нац. меншасьцях мае быць законы ў Чэхаславаччыне... А нам здаецца, што ўзорам для яго ёсьць Польшча, разам з яе „языковымі уставамі."

З Літоўскага жыцьця.

Сьвята незалежнасьці Літвы. Літоўскі народ ад 1918 году ў дзень 16 лютага штогод урачыста абходзіў вялікае народнае сьвята — незалежнасьці Літвы.

Гэтае гадавое народнае сьвята, Літоўскі народ сёлета 16 лютага абходзіў ужо чатырнаццаты чарговы раз.

Сьвята незалежнасьці Літвы літоўцы сьвяткуюць у Літве незалежнай і ў Вільні.

Па прыкладу мінулых гадоў, віленскае літоўскае грамадзянства і сёлета дзень 16 лютага, ў 14 ыя ўгодкі абвешчаньня незалежнасьці Літвы, абходзіла вельмі урачыста: — зраньня набажэнствам у касьцеле сьв. Мікалая, падчас якога пяяў прыгожа літоўскі касьцельны хор і ў часе якога сказаў прасамоўнае казаньне кс. праф. Краўяліс, а вечарам — урачыстай акадэміяй.

У часе акадэміі выразілі салідарнасьць літоўскаму народу прадстаўнікі ад украінцаў і беларусаў прывітальнымі прамовамі. Ад беларусаў вітаў сэкрэтар Бел. Нац. К-ту інж. А. Клімовіч.

Акадэмія закончылася вялікай мастацкай вар'ясьці канцэртам.

Пры гэтай нагодзе вітаем і мы Літоўскі народ, з якім лучыцца народ Беларускі сваей прешласьцю і сучаснасьцю.

Чытайце і пашырайце „Беларускую Крыніцу!"

Беларускі выдавецкі рух у Вільні за 1931 г.

A. W.: Adam i Anielka, apawiadańnie. Wydańnie „Biel. Krynicy", Wilnia 1931 h. Bačynaŭ 68.

Акінчыц Ф.: Чаму гэта так сталася? (Да справы выезду заграніцу былых правадыроў Грамады). Вільня 1931 г. Бачынаў 16.

Беларускі календар на 1932 г. (кніжка) Выданьне Беларускага Рэлігійна грамадзкага Саюзу, Вільня, 1931 г. Бачынаў XXXII + 64.

Беларускі календар на 1932 г. (кніжка). Выданьне Цэнтрасаюзу, Вільня 1931 г.

Беларускі адрыўны календар на 1932 г. Выданьне Ул. Знамяроўскага, Вільня 1931 г.

Бянкі В.: Мышавё Пік. Выданьне Аб'яднаньня беларускіх жанчын ім. А. Пашкевічанкі (Цёткі). Вільня 1931 г. Бачынаў 46.

Вар: Палітычныя і грамадзкія кірункі ў мінуўшчыне і сучаснасьці. Выданьне „Шляху Моладзі", Вільня, 1931 г. Бачынаў 34.

Драздовіч Яз.: Нябесныя бегі. Выданьне аўтора. Вільня, 1931 г. Бачынаў 24.

Instrukcyi i Rehulamin Bielaruskaha Instytutu Haspadarki i Kultury. Wydańnie Biel. Instytutu Hasp. i Kultury, Wilnia, 1931 h. Bačynaŭ 45.

Колас Якуб: Новая Зямля, паэма. Выданьне Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. Вільня, 1931 г. Бачынаў 285.

N. K.: Światy Rym. Wydańnie „Chryścijanskaj Dumki", Wilnia, 1931 h. Bačynaŭ 65.

Ruščaniec J.: Pieršyja łastaŭki, sceničny abrazok z bielaruskaha žyćcia Bielastoččyny. Wyd. Biel. Inst. Hasp. i Kultury. Wilnia, 1931 h. Bačynaŭ 24.

Скарыніч Врачыслаў: Нашто й як зьбіраці геаграфічныя й асабовыя назовы беларускія? Выданьне Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні. Вільня 1931 г. Бачынаў 16.

Stankiewič Ad. Kazimier Swajak. Narysy ab Jahonaj idealohii (U 5 yja ŭhodki śmierci). Wydańnie „Chryścijanskaj Dumki", Wilnia, 1931 h. Bačynaŭ 57.

Swajak Kaz.: Kupalle. Fantazija — misteryjum, snawanaja na bielaruskaj mitolohii. Wydańnie „Biel. Krynicy", Wilnia, 1931 h. Bačynaŭ 15.

Zaduma P.: Kupalle. Apawiadańnie. Wydańnie „Chryścijanskaj Dumki", Wilnia 1931 h. Bačynaŭ 70.

Ziaziula Andrej: Z Rodnaha zahonu. Zbornik wieršaŭ z pradmowaj Ad. Stankiewiča ab žyćci, tworstwie i dziejnaści A. Ziaziuli ŭ 10-yja ŭhodki śmierci jaho. Wydańnie ks. J. Siemaškiewiča, Wilnia, 1931 h. Bačynaŭ 175.

У Гэльсінгфорсе (у Фінляндыі) вышаў з друку

Новы Запавет і Псальмы. Выданьне Брытанскага замежнага біблійнага т-ва (мэта дыстаўскае), Гэльсінгфорс 1931 г. Бачынаў 446.

Беларуская пэрыодычная прэса ў Зах. Беларусі за 1931 г.

„Беларуская Крыніца" палітычная, грамадзкая і літаратурная газэта. Выходзіць раз у тыдзень, раз гражданкай, раз лацінкай. Год выданьня XV-ты. Падпіска на год 4 зл., заграніцу — ўдвая даражэй. Адрэс: Вільня, Людвісарская вул. 1—19.

„Chryścijanskaja Dumka" bielaruskaja katalickaja dwutydniowaja časopiś. Hod wydańnia IV-ty. Padpiska na hod 5 zł., zahranicu — ŭdwaja daražej. Adres: Wilnia, zawuł. św. Mikałaja 8—3.

„Шлях Моладзі" месячная часопісь беларускай моладзі. Год выданьня III-ці. Падпіска на год 2 зл., заграніцу — ўдвая даражэй. Адрэс: Вільня, Завальная 6—10.

Саха, месячнік сельскае гаспадаркі і кооперацыі. Выходзіў у першых месяцах мінулага 1931 г. як III-ці год выданьня.

Сьветач Беларусі — орган Цэнтр. Белар. П. ав. Камітэту. Год выданьня II-гі. Вышла 3 нумары. Адрэс: Вільня, Летняя вул. 12-3.

„Беларускі Звон" — орган беларуска-польскіх санатараў (група Астроўскага і А. Луцкевіча). Год выданьня І-шы. Падпіска на год 4.50 зл. Адрэс: Вільня, Вострабрамская 9.

„Голас Праўды" — орган бел.-польскіх санатараў-сацыялістаў (група Акінчыца). Вышла пяць нумароў.

„Novaja Varta" — orhan bielaruskaj studenskaj korporacyi „Scorinia" (polonofilski). Wyšaŭ adzin numar. Adres: Wilnia, Mickiewiča 11—9.

„Голас Праваслаўнага Беларуса" — орган незалежнай (беларуска-польскай савацыі) царкоўна грамадзкай думкі. Вышаў адзін нумар. Адрэс: Вільня, Вострабрамская 9-15.

„Беларуская Думка" — тыднёвая газэта, пісаная страшна перакручанай беларушчынай і адкрыта падтрымоўваючая ў нас сучасны польскі палітычны рэжым г. зв. „Беспартыйнага Блёку". Выходзіць у Горадні.

„Беларуская Праўда", **„Праўда"** і **„Слова Праўды"** — аднадзёўкі беларускіх санатараў-сацыялістаў (група Акінчыца).

Усяго за 1931 г. вышла 18 беларускіх кніжак, 10 часопісаў пэрыодычных і 3 аднадзёўкі.

Аглядчык.

Нездэцыдаванасьць ці тактыка?

(З студэнскага жыцьця).

У гэтым часе, у апошнім з 1931 г. нумары „Б. Крыніцы," былі апублікаваны некаторыя пастановы Надзвычайнага Сходу сяброў Беларускага Студэнскага Саюзу, якія адбыўся дня 13.XII. 31 г. Адна з іх адносілася да корпорацыі „Scorinii." Гэтай пастановай, як ведама, агульны сход аб'явіў таварыскі байкот сяброў К! „Scorinii" за іх тагодвыя выступленьні ў адносінах да Бел. Студ. Саюзу; сябру-ж К! Scorinii М. Маркевіча, як найбольш вінаватага, гэнай-жа пастановай Сход рашыў пацягнуць да дысцыплінарнай адказнасьці ў Акадэміцкі Суд У. С. Б.

Згодна з абавязуючымі студэнскія арганізацыі аўтономічна-унівэрсытэцкімі правамі, пастановы якой-кольвек студэнскай арганізацыі павінны найпазьней у 48 гадзін пасьля іх прыняцьця быць перададзены дзеля зацьверджаньня т. зв. Апякуну—Куратару, — як кантрольнай інстытуцыі з боку унівэрсытэцкіх уладаў над дзейнасьцю гэнай-жа студэнскай арганізацыі, — у выпадку, калі Куратар падчас прыйманьня пастановаў на сходзе ня быў прысутным і пастановы датычылі спраў, непрадугледжаных у парадку дзенным сходу.

Многалетнім Куратарам Б С С ёсьць паважаны праф. Станіслаў Уладычка. На ўспомненым вышэй Бел. Студ. Сходзе Куратар Б. С. С-зу ня было і дзеля гэтага пратакол сходу,—а ў ім і пастановы апошняга,—у вызначаным унівэрсытэцкім правам часе быў Куратару дарučаны адпаведнымі ўладамі БСС.

Праф. Уладычка, разгледзіўшы пратакол, вілаць адразу ня мог здэцыдавацца, што зрабіць з пастановамі, прынятымі ў справах — не прадугледжаных у парадку дзенным сходу. І толькі ў канцы студня гэтага году, гэта зн. больш як праз месяц часу, Урад Б. С. С. атрымаў ад свайго Куратара паперу, якой праф. Уладычка — апіраючыся на адпаведныя параграфы успомненага вышэй унівэрсытэцкага права і ставячы заківы характару фармальнага — уневажняе ўсе пастановы Сходу, датычачыя як самой К! Scorinii, так і паасобных яе сяброў*)

У сувязі з гэтым вытварылася на грунце Б. С. С. парадоксальная сытуацыя, —сытуацыя, калі стан фактычны ёсьць супярэчны з станам фармальна-праўным.

Гэнае уневажненьне пастановаў, якія перад гэтым больш як праз месяц часу выконываліся, а пасьля гэтага-ж уневажненьня салідарна выконываюцца сябрамі Б.С.С. (бо-ж не дарма яны сходам прымаліся!) — de iure вярнула правы сяброў Б.С.С. тым сябрам К! Scorinii, каторыя іх былі пазбаўлены de facto гэнымі-ж пастановамі сходу. Тады-ж „самілаваныя" Куратарам „скарынінцы," карыстаючыся з вернутых ім праваў у *сэнсе фармальным* і не зважаючы на далейшы іх байкот з боку сяброў Б.С.С. — пачалі адразу-ж ад дня ўневажненьня пастановаў амаль штодня „складаць" дэмонстрацыйна „візыту" у памешканьні Б.С.С.**) Ня можна гэнай дэмонстрацыйнай візыты інакш назваць, як толькі дэмонстрацыйнай граваканыяй сяброў Б С.С. з боку „скарынінцаў," асабліва-ж, калі возьмем пад увагу той факт, што сярод „візытуючых" знаходзяцца тыя з корпорантаў, якія сваім нягодным паступаньнем найбольш ёсьць вінаўнымі перад Б С С. Але, як раней, — на сходзе і перад ім, — так і ў гэтым выпадку — сябры Б.С.С., разумеючы выразныя пляны „скарынінцаў" адносна аграмаднай большасьці ўсяго Б.С.С., да ўспомненай дэмонстрацыйнай правакацыі адносьліся і адносяцца тактоўна, цярпліва, адным словам,—не адказалі ўласьцівым „скарынінцам" спосабам.

Вось больш-менш сытуацыя, якая вытварылася на Надзвычайным Сходзе Сяброў Б.С.С. з дня 13.XII г. агулам, а па ўневажненьні ягоных пастановаў куратарам Б.С.С.— у асобнасьці. Сытуацыя, як бачым, ненармальная. Стан фактычны у плошчы суадносінаў Б.С.С. да К! Scorinii колідуе з станам фармальна—праўным.

Найлепшым выхадам з такой сытуацыі было-б склíканьне *новага* Надзвычайнага Сходу сяброў Б.С.С., на якім-бы завіданая Куратарам „нефармальнасьць" была-б эвэнтуальна папраўлена. Але не! Куратар відаць мала інтэрэсуецца палажэньнем, у якім апынуўся Б.С.С. дзякуючы ягонай-жа дэцызыі; не стараецца ў хуткім часе яго ліквідаваць. А до оснна склíканьня новага Надзвычайнага Сходу Куратар перад Урадам Б.С.С. выразіў няраз становішча няпрыхільнае. Дык застаецца чакаць звычайнага сходу, які нармальна апошнімі гадамі адбываецца ў траўні месяцы. Пэўне-ж, нікаму патрэбна чаканьне. П радуюм — самым „скарынінцам," якім залежыць на тым, каб час „заляччыў" іх „штукі", — дый іхным „апякуном." А тымчасам нельга нармальна працаваць Б.С.С. з „сваім закальцам."

Дык Урад Б.С.С. з увагі на вытвараны стан, які пусьціў у выніку ўневажненьня Куратарам пастаноў з 13.XII 31 г. адносячыхся да К! Scorinii, а так-жа з увагі на ведамае няпрыхільнае становішча Куратара ў справе склíканьня новага Надзвычайнага Сходу Сяброў Б.С.С., — *пастанавіў пайсьці да дымісіі*. Дымісію, як даведываемся, пасьля даволі доўгага разважаньня, Куратар прыняў і даручыў гэтаму-ж Ураду *часова* выконываць свае функцыі, — да часу ўстанаўленьня Куратарам асобы, якая-б выконывала часова функцыі Ураду Б.С.С., інакш кажучы да устанаўленьня т. зв. Камісара, (інстытуцыі модная у нашыя часы!).

У канцы мінулага тыдня (11.II.32), як даведываемся, Праф. Уладычка назначыў на „Камісара" сябру Б.С.С. Т. Кувіцкага.

* *
*

Прыняўшы пад увагу вышэй сказанае, сканстатаваць можна, што з боку праф. Уладычкі праявілася нейкая нездэцыдаванасьць адносна падзей у грувне Б.С.С.

Ці-ж ня ёсьць тут „gra na zwłokę", з якой маюць скарыстаць „слаўныя малайцы скарынінцы"? Або,—ці ня ёсьць тут „стратэгічныя" манэўры тых закуліcных дзейнікаў, у якіх інтарэсе было і ёсьць разьбіць сцэмантаваную і згарманізаваную волю аграмаднае большасьці сяброў Б С С.? А можа і адно і другое.

Калі так, то дарэмныя мяркаваньні! Выкім іх можа быць толькі чарговая компромітацыя „скарынінцаў"! Я.

*) Апроч успомненых вышэй і апублікаваных у „Бел. Крыніцы" пастановаў, адна з пастановаў датычыла так-жа самой К! Scorinii — імення: пастанова аб забароне маложыць сябром Б.С.С. да К! Scorinii.

**) Характэрна, што „скарынінцы" раней ад сяброў Б.С.С. *ведалі аб уневажненьні пастановаў!*

З Польшчы.

Рэформа школаў. У Сойм унесены ўрадам праект, паводле каторага ўсе ніжэйшае і сярэдняе школьніцтва мела-б быць зрэформавана. Ніжэйшыя школы складаліся б з 3-х груп (концэнтраў): першая група мела-б 4 клясы (аддзелы) і давала-б першыя пачаткі граматы, другая група —гэта 5 і 6 клясы, якія мелі-б практычна-гаспадарчую праграму, а да трэцяй групы належала-б 7-ая кляса, куды ішлі-б дзеці, якія далей ужо ня вучыліся б. 7-ая кляса была-б завяршэньнем (якбы „шапкаю") усей навукі ў народных школах. Дапаўняючую асьвету для гэтых „паўшэхнікаў" (да 18 гадоў) праводзілі-б культурна-прасьветныя арганізацыі.

У сярэдзія школы (гімназіі) паступалі-б дзеці, якія кончылі 6 кляс народнай (паўшэхнай) школы. Гімназіі, паводле новага праекту, будуць мець толькі 4 клясы (ад сяньняшняй 3 да 6 уключна). Яны давалі-б агульную асьвету, патрэбную ў штодзенным жыцьці. Калі-б хто з вучняў хацеў далей вучыцца, то паступаў бы на 2 гады ў ліцэй (сяньняшнія 7 і 8 кляса), дзе прыгатаўляўся-б да студыяў на ўнівэрсытэце.

Вось якімі фармальнасьцямі і парогамі абстаўлена будзе асьвета ў Польшчы. Нашаму брату да гэтых школаў прыступіцца трудна будзе і здабыць вышэйшую асьвету нашай маладзяжы будзе яшчэ трудней, чым цяпер.

Рэформа мае датычыць так-жа тэхнічных школ. Там будзе таксама 3 ступені: 1) ніжэйшая — будзе раўняцца 7-мі гадовай народнай школе, 2) сярэдняя — чатырох клясам гімназіі і 3) ліцэальная — з двухгадовою ліцэальною праграмаю. Кончыўшыя тэхнічныя ліцэі будуць магчы паступаць на некаторыя факультэты ўнівэрсытэту.

Апроч гэтых праектаў апрацоўваецца праект рэформы прыватных школаў.

З заграніцы.

Справа Клайпэды перад Лігай Народаў. Літва, як ведаем, ськінула з становішча старшыню клайпэдзкай дырэкторыі Бётхэра, а на яго месца назначыла новага старшыню. Процій гэтага назначэньня стаў клайпэдзкі соймік і Нямеччына, каторая перадала ўсю справу на разгляд Рады Лігі Народаў. Нямеччына жадала: адмены ўсіх апошніх распараджэньняў літоўскага ураду ў Клайпэдзе, а галоўнае — скасаваньне нованазначанай дырэкторыі і паварот старой, а так-жа адставкі літоўскага губэрнатара ў Клайпэдзе Мэркіса.

У суботу 13.II. нямецкая скарга разглядалася на Радзе Лігі. Літоўскі мін. Заўніус даказываў, што старшыня Бётхэр дзеяў на шкоду Літвы. Рада пастанавіла аддаць гэту справу на разгляд камісіі праўнікаў.

Адносіны паміж Літвою і Нямеччынай сталі вельмі нацягнутымі. Гітлераўцы нават заклікаюць да вайны.

Чуткі. Нямецкія газэты пішуць, што Літва хоча скасаваць клайпэдзкую аўтаномію і далучыць Клайпэдзкі вокруг, як простую літоўскую правінцыю, да Літвы. Літоўскі ўрад запярэчыў гэтаму.

Ізноў нямецкая газэта „Angriff" пусьціла вестку, што Польшч зьбірае войска і хоча заняць Гданск. Аднак польскі ўрад запярэчыў гэтай вестцы.

Польскія газэты спадзяюцца, што спор Літвы з Нямеччынай зьбліжыць Літву да Польшчы.

Каля Шанхаю гатовяцца да рашучай бітвы. Японцы падвозяць усё новыя сілы. Лік японцаў ужо перавышае 30 тысяч. Але і кітайцы ня дрэмлюць і таксама сьцягваюць з усюль свае палкі. Кітайска-японскі фронт расьцягваўся ўжо каля Шанхаю на 23 кілм. Японскі адмірал Номура, які перaняў галоўную каманду над усімі японскімі сіламі каля Шанхаю, заявіў, што на перагаворы ўжо няма часу. Спор паміж японцамі і кітайцамі вырашыць толькі бітва. Тымчасам японскія аэрапляны закідаюць Шанхай бомбамі. Характэрна яшчэ і тое, што, ня гледзячы на кіданьне бомбамі на горад, японскі дэлегат на конфэрэнцыі разаруженьня дамагаўся забароны кідаць бомбы з аэрапляна!..

Муссоліні ў Папы Рымскага. 11 г. месяца італьянскі дыктатар Муссоліні адведаў Папу. Газэты падаюць, што Муссоліні, вітаючыся з Папай і прымаючы ад яго багаславенства, стаў на калені. Папа ў гутарцы бяндцам заявіў, што з вялікім неспакоем сьлядзіць за цяперашнім напружаньнем міжнароднага палажэньня. З гэтых адведзін робяць вывад, што Муссоліні ня будзе болей выступаць процій каталіцкага касьцёла.

Згоднасьць у справе адшкадаваньняў наступіла паміж Англіяй і Францыяй. Няма ведама толькі, ці гэта згоднасьць датычыць часу склíканьня канфэрэнцыі ў справе адшкадаваньняў, ці самых адшкадаваньняў. Магчыма, што Францыя і Англія згаварыліся, колькі аканчальна вымагаць ад Нямеччыны ваен. адшкадаваньняў.

Літоўская скарга на Польшч перадана ў Лігу Народаў за закрыцьцё ў Віленшчыне 10 літоўскіх школ. Літоўскі ўрад просіць Лігу зрабіць уплыў на Польшч, каб яна адкрыла зачыненыя школы.

Японія грaзіць. Англійскія газэты пішуць, што Японія падала да ведама Ліг

Новую школьную рэформу маюць праводзіць ад 1-га ліпня 1932 г. на працягу 6 гадоў.

Безработных у Польшчы 336 тысяч. Помач для іх маюць зьменшыць.

ППС процію ураду. У часе спрэчак над дзяржаўным бюджэтам у Сойме даходзіла да вельмі вострых выступленьняў некаторых паслоў, асабліва з боку ППС. І так — пасол Арцішэўскі грaзіў народным гневам, а пасол Недзялкоўскі заявіў, што ППС ня будзе галасаваць за наборам новых рэкрутаў, бо ня мае да ўраду даверу. — Нам здаецца, што усе гэтыя грозьбы ППС. ёсьць звычайным „ківаньнем пальцам у боце", бо ППС. ня мае ніякай сілы.

Устава аб найме работнікаў мае быць унесена у Сэйм. Паводле гэтай уставы наймаць работнікаў можна будзе толькі пры пасярэдніцтве дзяржаўных установаў.

Народаў, што калі Ліга вынясе пастанову, спрэчную з інтарэсамі Японіі, то Японія выйдзе з Лігі. Калі-б гэта сталася, то Ліга развалілася-б і страціла-б той цень павагі, які яна дагэтуль мела.

Дымісія ўраду Лявяля наступіла 16. II. 1932 г. з прычыны выступленьня большасьці францускага сэнату проціў ураду. Прычынай выступленьня маюць быць няўдачы Лявяля ў міжнароднай палітыцы. Бліжэйшых вестак пакуль-што няма.

Канфэрэнцыя ў справе разаружэньня агранічылася дэклярацыямі і пажаданьнямі розных урадаў. Характэрыстыку дэклярацыяў пададзём у наступным нумары нашай газэты.

Замест адказу А. Луцкевічу, чаму беларусы лучыцца з ім ня хочуць.

Ант. Луцкевіч у сваім полёнофільскім „Бел. Звоне" (12.II. 1932 г.), з нагоды аб'яднаньня літоўцаў, заяўляе, што факт гэты — гэта цікавы прыклад для беларусаў, у якіх ёсьць людзі, якія, быццам, не дапускаюць да аб'яднаньня. Вось-жа мусім тут выясьніць, што беларускае незалежнае ад польскае палітыкі грамадзянства ёсьць аб'яднаным у Бел. Нац. Камітэце, да якога не належаць толькі польскія лякаі, як Тодар Вярнікоўскі, А. Луцкевіч, Р. Астроўскі і пара іншых, якія ўбіцца ў гэты Камітэт стараюцца ўсімі сіламі, а якіх туды ня пускаюць. І добра робяць! Розныя Аляксюкі, Паўлюкевічы, Валэйшы, Умястоўскія, Вярнікоўскія заўсёды мелі за заданьне разьбіваць беларускі рух. Цяпер-жа гэтае самае заданьне прынялі на сябе, годныя сваіх папярэднікаў, Луцкевіч і Астроўскі. Чытачы нашы прыпамінаюць, як гэтая „пара гнедых", залажыла полёнофільскі „Цэнтрасаюз", каб разьбіваць працу Бел. Нац. К-ту і Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры, як падчас апошніх выбараў, рабіла, паводле іх-жа самых слоў, „дывэрсію" — (каб не прапусьціць беларусаў у Сойм і гэтым памагчы Б.Б.) і як да незалежнага беларускага блёку, аб'яднанага з украінцамі, прысылала Ф. Акінчыца, з трэбаваньнем у 24 гадзіны парваць гэны блёк. Прыпамінаем так-жа, што лідэр гэтага найнавейшага полёнофільства Ант. Луцкевіч, на працэсе Грамады (у судзьдзі сьледчага Падоскага) выракся нават беларускасьці, называючы сябе „białorusinem-polakiem". Той-жа самы ўрэшце А. Луцкевіч, з пад якога апекі сяньня выходзіць „Голас Праваслаўнага Беларуса", яшчэ мінулага лета, пасьля таго, як дзеля дагаджэньня польскім уладам трэбаваў, каб беларусы з украінцамі парвалі блёк, быў у Львове, дзе прапанаваў свае ўслугі ў справе пашыраньня уніі сярод праваслаўных беларусаў. — Вось-жа гэты чалавек, пазбаўлены ўсякіх пракананьняў, жадае нейкага аб'яднаньня! Ясна, што беларускае грамадзянства на аб'яднаньне з гэткім „дзельцом" ня пойдзе, бо ня мае права пайсьці. Сяньня ўжо не сакрэт, што Луцкевіч — гэта змора над беларускім адраджэньнем, гэта, як слушна мовай Дастаеўскага яго назваў В. Ластоўскі — беларускі Сьмердзякоў.

І вось гэты Луцкевіч кажа — а ўсё-ж літоўцы аб'ядналіся. Так, адказваем, бо там было непаразуменьне часткаў грамадзянства, маючых розныя сьветапагляды, а ў нас аб'яднаньне з Луцкевічам быць ня можа, бо нас з ім рожніць не ідэолёгія (Луцкевіч такой ніколі ня меў), а тое этычна-грамадзкае пракананьне, што калі ён з кумпаніяй абапёрся на „Wydział Bezpieczeństwa" — сілай лёгікі фактаў выкідаецца за бераг грамадзянства, як няздольны да вызвольнай барацьбы.

—і—

ГРАМАДЗЯНЕ!

Не забывайцеся аб сваіх студэнтах беларусах!

Складайце ахвяры на «Стыпэндыяльны Фонд»!

Ab haspadarcy.

Ab sievazvarotach u haspadarcy.

Sievazvarotam u haspadarcy nazyvajem čarhavańnie raścin ziemlarobskaj vytvorčaści na adnym i tym-ža poli, pavodle peŭnych, z-hary ŭstalenych praviłaŭ. Hetak, na biełaruskich ziemlach da siahońnia najbolš pašyranym jošć sievazvarot trochpalovy, inakš viedamy jak *trochpaloŭka*. Apošnim časam adnak, asabliva pašla vajny, na trochpaloŭku pasypalisia zakidy, što jana, byccam jošć pryčynaj usiej sialanskaj u nas hality. Ci-ž tak jošć u sapraŭdnaści?

Voś-ža, asnaŭnoje haspadarskaje praviła kaža, što niama najlepšaj metody — a sievazvarot jošć m e t o d a j — haspadarki i niama najhoršaj i što ŭ haspadarčych spravach usio zaleža ad času i miejsca: što było dobrym učora, nia musić być dobrym i siahońnia, što ŭdajecca ŭ dalšaha ci bližejšaha susieda, nie kaniešna musić udavacca i ŭ nas. Istotu, značeńnie i zastasavańnie haspadarčaha sievazvarotu lepš zrazumiejem, kali pryhledzimsia, jak hety sievazvarot raźvivaŭsia.

Pieršapačatnaj formaj ziemlarobstva, kali čałaviek tolki što pakinuŭ na pałovu dziki sposab žyćcia p a ł a ŭ n i č y, była haspadarka k a č o ŭ n a j a: čałaviek utrymlivaŭsia z hadoŭli roznaj asvojenaj žyvioły, z katoraj pierasuvaŭsia (pierakačovyvaŭ) štoraz na inšaje miejsca, jak tolki na miejscy starym nia było ŭžo kormu dla žyvioły.

Z časam adnak vymahańni čałavieka raśli: jon pačaŭ sieić i hadavać zbožža. *Čarhavańnie* zasiejenaha zbožžam pola z polem niezasiejenym było ŭsialakaje *i mianiałasia pieradusim u toj miery, jak źmianšaŭsia zapas ziamli.* Spačatku sieiłasia zbožža na adnym poli, pakul jano radziła, a tady pierachodziłasia na pole inšaje; pašla — sieili zbožža na adnym poli što druhi hod i tady ŭźnikaŭ dvupalovy sievazvarot abo dvupaloŭka; časam uznoŭ sieili na adnym i tym-ža poli: u 1-šym hodzie — azimaje zbožža, u 3 cim — jaravoje, a ŭ 2-him i 4-tym — pakidali heta pole na paśbišča i hetak uźnikaŭ sievazvarot čatyrochpalovy. Jak pry dvuch, tak i pry čatyrochpaloŭcy pałova pola ŭ kožnym hodzie lažała pad paparam i nijakoj karyści nie davała. Z časam adnak, kali lik ludziej stała pabolšyvaŭsia, a zapas ziamli, naadvarot, pamianšaŭsia, nielha było pakidać kožny hod pustavać pałovu ziamli: na heta pustavańnie adviedziena była tolki treciaja čašć ziamli, a rešta, dźvie čašci byli zasiejeny: — adna — azimym zbožžam, a druhaja — jaravym. Hetak paŭstała trochpaloŭka, jakaja dačakałasia i našych dzion: papar, azimina i jaryna.

Ziamielny hoład adnak cisnuŭ i ciśnie dalej i trochpaloŭka pamału, ale stała mianiaje svoj pieršapačatny vyhlad i sens Na vačoch i pamiaci najmałodšaha ŭžo pakaleńnia ŭ nas papar napałovu kasujecca i zamianiajecca kaniušynaj. Z časam uznoŭ — choć dahetul nia ŭsiudy — kasujecca ŭ nas i druhaja pałova paparu dy zasadžyvajecca bulbaj. Takim čynam z zvykłaj trochpaloŭki paŭstała trochpaloŭka ź l e p š a n a j a: 1. pałova paparu — akopniny (bulba), pałova — kaniušyna, 2. azimina i 3. jaryna. Kali-ž kožnuju z źmienaŭ źlepšanaj trochpaloŭki padzialić papałam, dyk atrymajem sievazvarot z nastupnym paradkam: 1. akopniny, 2. aziminy,*) 3. jaryna, 4. kaniušyna, 5. aziminy i 6. jaryna.

Vyhady źlepšanaj trochpaloŭki, u paraŭnańni z trochpaloŭkaj zvyčajnaj, nastupnyja:

1. płošča aromaha pola pavialičyvajecca na adnu tracinu;

2. kasujecca palavy prymus (prymus napr. sieić žyta ŭ adnym poli), a ŭśled za hetym kasujucca supolnyja paśbiščy i sama supolnaja paša;

3. pašnyja raściny (kaniušyna, karmavy burak), vyhadavanyja na aromym poli, dajuć mahčymašć uniezaležnić hadoŭlu žyvioły ad byćcia ci niabyćcia ŭ haspadarcy sienažaciaŭ dy pazvalajuć zavieści karmleńnie žyvioły ŭ chlavie praz cely hod; hetym samym papraŭlajecca hadoŭla, u haspadarcy prybyvaje hnoju, a ŭśled za hetym pavialičyvajecca i ŭradžaj na poli.

Niavyhada hetaj-ža źlepšanaj trochpaloŭki ŭ tym, što pry joj u rabočy čas nabirajecca za šmat sročnaj pracy, silniej adčuvajecca niedachop polnych daroh (pry cierazpałosicy) i pahražaje niebiaśpieka zdaroŭju zapiortaj u chleŭ praz cely hod svojskaj žyvioły.

*) Pavodle praviłą, azimin pašla akopninaŭ davać nielha.

Да нас пішуць.

АБ НАШАЙ ВЁСЦЫ.

Грыцькавічы, Нясьвіскага пав. У нас усе беларусы і ўсе праваслаўныя. Недалёчка і цэркаўка ёсьць. Ёсьць і школа, ды не адна, але дзьве. Быў у нас вучыцель Сяргей, любілі яго ўсе, але яго школьныя ўлады звольнілі. Ён беларус. Да людзей ён гаварыў заўсяды пасвойму — пабеларуску. Вучыцель Сяргей часта ладзіў беларускія прадстаўленьні і расказываў старэйшым аб жыцьці-быцьці і ўсё пасвоему — пабеларуску.

Нашы людзі ніяк ладумацца ня могуць, зашто ўлады звольвілі вучыцеля Сяргея. — Адны кажуць затое, што ён на сьв. Міколу хадзіў у цэркву і ў той дзень ня вучыў дзяцей, а другія цьвердзяць, што за яго беларускасьць. А зашто, дык і ніхто дагадацца ня можа.

Няма ўжо ў нас вучыцеля Сяргея, а ў нас якраз і патрэба такіх вучыцялёў-Сяргеяў, якія разумеюць нашу мову, нашы патрэбы і нашых дзяцей да дабра даводзілі б.

Янкаў Андрэй.

БЕЛАРУСКІ РУХ У МАЛАДЭЧАНШЧЫНЕ.

У Маладэчанскім павеце жывуць пераважна беларусы праваслаўныя. Каталікоў беларусаў тут ня шмат.

Беларускі адраджэнскі рух у нашым павеце цяпер неяк прыдушаны, а гэта таму, што беларускасьць тут уважаецца чамусьці за праяву камуністычную. Найбольш сьведамыя і больш дзейныя беларусы няслушна абзываюцца камуністамі, бо многа ёсьць такіх, што сядзяць у вастрогах засуджаныя за камунізм і многія знаходзяцца пад надзорам паліцыі западозраныя ў камунізьме. Ах гэты „камунізм," нямала ён прычыніў нашым людзям гора і сьлёз, нямала прычыніўся і да разбурэньня беларускага народнага адраджэньня.

Школаў чыста беларускіх у нашым павеце ня чутно, незважаючы на тое, што насельніцтва павету ў 95 проц. беларускае. Ёсьць некалькі запісаных на паперы школ утраквістычных, польска-беларускіх, але аб беларускасьці ў гэтых школах ня чутно.

Падчас перапісі насельніцтва, даволі было прызнацца, што разумееш польскую мову, каб хапіла даных камісару запісаць у рубрыцы „енэык ойчысты" мову польскую.

М. Палачанскі.

ЯК АСАДНІК СТАЎСЯ ВОЙТАМ.

Палачаны, Маладэчанскага пав. У канцы мінулага 1931 году наша гмінная Рада аж два разы выбірала войта і абодва разы выбірала свайго чалавека — беларуса. Але паветавы староста, карыстаючыся правам надзору над самаўрадамі, выбранцаў не зацьвердзіў і назначыў у нашу гміну войтам асадніка Лявона Околува.

Радны.

З краю.

— У Браславе арыштаваны фальшывы судзьдзя сьледчы Гэнрык Бутрым. Як аказалася, ён меў падробленыя дакуманты, а яго сапраўднае прозьвішча — Браніслаў Пятровіч.

— У Сьвянцянах школьныя ўлады загадалі прыходзіць літоўскай маладзяжы на набажэнства разам з польскай. У апошнюю нядзелю (14. II. 1931 г.) на набажэнства прышла толькі горстка літоўскай моладзі, якая дамагаецца свайго набажэнства. Бацькі вучняў зьбіраюць подпісы, якія з адпаведнай просьбай маюць перадаць віл. арцыбіскупу, школьным і ваяводзкім уладам, дамагаючыся для сваіх дзяцей дадатковага набажэнства (навукі, песьняў) ў літоўскай мове.

Jak-by jano nia było, usio-ž, zaviadzieńnie źlepšanaj trochpaloŭki ŭ ziemlarobstvie spatrabuje značny ŭkład pracoŭnych sił i kapitału i aznačaje vialiki postup. Spatykajemsia z joj siańnia ŭ bolšaści kulturnych krajoŭ, dzie siejecca šmat kałasistych zbažžavin, ale nia šmat akopnin.

Źlepšanaja trochpaloŭka ŭ bolšaści vypadkaŭ jošć kaniešnym, pierachodnym stupniom da sievazvarotu bahaciejšych krajoŭ — norfolskaha, šašci — i šmatpalovaha.

inž. A. K.

Рэдактар Ян Пазьняк.

Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня.

Выдавец А. Шутовіч.